белорусскую народную тему для фортепиано с оркестром»). Вместе с тем необходимо отметить, что в двухчастном концерте Д. Смольского усиливается роль программного начала, возникают элементы перформанса (впервые слово перформанс было применено к своему произведению-действию композитором Дж. Кейджем в 1952 году, исполнившим на сцене «4'33"»).

Особенно поиски новых художественных образов характерны для сочинений белорусских композиторов рубежа XXI века. Концерты для фортепиано с оркестром приобретают разнообразные программные названия – «Поэт в Нью-Йорке» (О. Сонин), «Свет догорающей свечи» (О. Ходоско), «Calipso» (А. Литвиновского), что указывает на новый этап развития этого жанра в белорусской музыкальной культуре.


1. *Степанцевич, К. И.* Белорусский концерт / К. И. Степанцевич. – Минск: Беларусь, 1967. – 55 с.

2. *Назина, И. Д.* Белорусский фортепианный концерт / И. Д. Назина. – Минск: Наука и техника, 1977. – 136 с.

3. *Назина, И. Д.* Белорусский фортепианный концерт: автореф. дис. … канд. искусствоведения: (17.00.02). – Киев, 1979. – 20 с.

4. *Антоневич, В. А.* Белорусский инструментальный концерт // Белорусская музыка 1960–1980-х годов / В. А. Антоневич; сост. К. И. Степанцевич; под ред. Г. С. Глущенко. – Минск: Беларусь, 1997.

5. *Антоневич, В. А.* Белорусская музыка XX века: композиторское творчество и фольклор: учеб. пособие для студентов высш., учащихся сред. спец. учеб. заведений культуры и искусства / В. А. Антоневич; Белорус. гос. акад. музыки, Проблем. науч.-исслед. лаб. музыки. – Минск: БГАМ, 2003. – 408 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


*В. У. Глаз, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – Р. Ф. Шаура,*
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар*


# СПАЛУЧЭННЕ МАСТАЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ УСХОДУ І ЗАХАДУ НА ПРЫКЛАДЗЕ АНАЛІЗУ БЕЛАРУСКАГА СЮЖЭТА ДАБРАВЕШЧАННЯ


*У артыкуле параўноўваюцца еўрапейскія, рускія і беларускія традыцыі адлюстравання сюжэта Дабравешчання. Аналіз падаецца па наступных крытэрыях: асаблівасці постаці*

*Архангела і Марыі (плоскаснае, каляровае вырашэнне, нахіленні галавы, выраз твару), агульная кампазіцыя, перспектыва, папулярнасць іканаграфічнага тыпу.*

Беларусь займае выгаднае геаграфічнае становішча. Гэта своеасаблівае перакрыжаванне, дзе сустракаюцца шляхі Еўропы і Азіі. Можа таму беларуская культура такая ўнікальная, разнастайная: стагоддзямі фарміравалася наша спадчына, якая арганічна злучала і пераапрацоўвала візантыйскія, старажытнарускія, заходнееўрапейскія мастацкія асаблівасці. Гэта можна заўважыць на прыкладзе вывучэння сюжэта Дабравешчання.

«Дабравешчанне» у традыцыйных візантыйскіх зводах выглядае так: Архангел Гаўрыіл, злятаючы з нябёсаў, звяртаючы погляд свой на Марыю, паведамляе ёй Добрую вестку і блаславуляе жэстам (альбо абедзве рукі ўздымае да Багародзіцы, альбо адной рукой трымае крыж ці світак са словамі прывітання). Марыя напісана ў правай частцы малюнка, часцей стаіць насупраць Архангела, часам, сядзіць, быццам на троне, і, паводле апокрыфаў, трымае ў руках ці верацяно (прадзе завесу для Ерусалімскага храма), ці гарлачык (чарпае ваду з крыніцы).



*Мал. 1. Мазаіка Сабора Святой Сафіі ў Кіеве (XI ст.)*



*Мал.2. Усцюжскае Дабравешчанне*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праваслаўны канон напісання іконы «Дабравешчанне» адрозніваецца строгасцю, «незямным» малюнкам. Да таго ж праваслаўны іканапіс прытрымліваецца строгіх правілаў напісання: пласкастное выяўленне, адваротная перспектыва.

Заходнееўрапейскае мастацтва больш вольнае ў малюнку сюжэта. Мастакі не прытрымваліся строгіх канонаў, адлюстроўваючы не нябесную таямніцу, а цуд, які абдыўся тут, на зямлі.

Найболей распаўсюджаны сюжэт Дабравешчання заходнееўрапейскага жывапісу – гэта малюнак, дзе Марыя чытае

кнігу прарока Ісайі, у момант з’яўлення Гаўрыіла. Але адрозненне было не толькі ў іншым ізводзе, – фон малюнка таксама меў іншую трактоўку. Так, італьянскія мастакі эпохі Адраджэння імкнуліся «адчыніць свет», таму пераносілі месца дзеяння ў адкрытую лоджыю або галерэю. Больш таго, мастакі, у прыватнасці, Леанарда да Вінчы, ставіць Марыю як бы ў больш дамінуючае становішча: яна вымушана глядзець зверху ўніз на Гаўрыіла, які схіліў калена перад Ей. Іспанскі мастак Эль Грэка наогул «пераносіць» сюжэт у нябёсы.



*Мал. 3. Леанарда да Вінчы «Дабравешчанне»*



*Мал. 4. Эль Грэка «Дабравешчанне»*

З вядомых малюнкаў сцэны Дабравешчання на Беларусі можна адзначыць «Дабравешчанне» з праваслаўнай царквы Ражаства Багародзіцы горада Слаўгарада (Слаўгарадскі раён, Магілёўская вобласць). Царква была пабудавана ў 1791–1793 гг. Служкі сцвярджалі, што гэты малюнак датуецца гэтым жа часам, што і сама царква.





*Мал.5/6. «Дабравешчанне» / царква Ражаства Багародзіцы (г.Слаўгарад)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сюжет Дабравешчання праваслаўнай царквы Ражаства Багародзіцы, што ў горадзе Чэрыкаў (Чэрыкаўскі раён, Магілёўская вобласць) падобны да папярэдняй выявы. Саму ікону прынеслі у новую царкву вернікі, якія знайшлі яе пад дахам старога дома; дарэчы, выяву вельмі шануюць у царкве.




*Мал.7/8. «Дабравешчанне» / царква Ражаства Багародзіцы (г.Слаўгарад)*

Частка ад царскай брамы царквы Аляксандра Неўскага (г. Мсціслаў Магілёўскай вобласці), якая, па словах служак, датуецца канцом XIX стагоддзя, таксама з'яўляецца прыкладам саюза усходніх і заходніх традыцый.




*Мал. 9/10. «Дабравешчанне» / царква Аляксандра Неўскага (г. Мсціслаў)*

Апошнія сюжэты (не гледзячы на тое, што знаходзяцца ў праваслаўных храмах) не вельмі падобныя на кананічныя візантыйскія або старажытнарускія выявы. Але ж і не надта падобныя да еўрапескіх выяў. Хутчэй, гэта нешта сярэдняе паміж усходнім іканапісам і заходнім рэлігійным жывапісам. Па становішчы фігур (жэст дабраславення Архангела Гаўрыіла, узнятае яго адно крыло, пакорлівыя лікі), можна ўбачыць іканапісныя традыцыі. Але ёсць нешта больш рэальнае, зямное ў поглядах, станах ад ідэй заходняга рэлігійнага жывапісу. Праваслаўныя іканапісцы спрабавалі адлюстраваць чароўнае адкрыццё, вышэйшую, незямную падзею, толькі злёг-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ку падняўшы завесу над таямніцай. Ікона прадугледжвае ўнутранае, духоўнае разуменне. Заходнееўрапейскія мастакі, наадварот, шукалі магчымасць выказаць нават у рэлігійным сюжэце прыгажосць рэальнага жыцця, сэнс зямнога існавання. Так, можна заўважыць па гэтых прыкладах, што беларускае «Дабравешчанне» гарманічна спалучыла і адно, і другое.


1. *Антонова, В. И.* Каталог древнерусской живописи XI – начала XVIII в. Опыт историко-ходужественной классификации: в 2 т. / В. И. Антонова, Н. Е. Мнёва. – М.: Искусство, 1963. – Т. 2. – 570 с.

2. *Библия.* – М.: Изд. Московской Патриархии, 1988. – 1376 с.

3. *Демус, О.* Мозаики византийских храмов. Принципы монументального искусства Византии / О. Демус; пер. с англ. Э. С. Смирновой; ред. и сост. А. С. Преображенский. – М.: Индрик, 2001. – 160 с.

4. *Земная* жизнь Пресвятой Богородицы / сост. С. Снессорева. – Ярославль: Норд, 2008. – 460 с.

5. *Маркелов, Г. В.* Книга иконных образцов: в 2 т. – 2-е изд., перераб. и доп. / Г. В. Маркелов.– СПб.: Изд. Ивана Лимбаха, 2006. – 584 с.

6. *Покровский, Н. В.* Евангелие в памятниках иконографии / Н. В. Покровский – М.: Прогресс-Традиция, 2001. – 564 с.



*Г. Ю. Емялёва, аспірант*
*БДУ культуры і мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – А. І. Смолік,*
*доктар культуралогіі, прафесар*


## ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ І ВЫВУЧЭННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЦАЦКІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЛЯЛЬКІ)

Лялькі вядомыя чалавецтву са старажытных часоў. На тэрыторыі Еўразіі знаходзяць дробную антрапаморфную пластыку, створаную каля 40 тысяч год таму. Лялькі найбольш блізкія з аднаго боку язычніцкім ідалам і драўлянай народнай скульптуры, а з другога боку – маскіраваным удзельнікам рытуалаў. Аналогіі прасочваюцца таксама з антрапаморфнымі аброчнымі крыжамі і культавымі камянямі. У самым агульным сэнсе лялька – антрапаморфны аб’ект, створаны дзеля пэўных маніпуляцый. Усе лялькі можна ўмоўна падзяліць на абрадавыя і пазаабрадавыя, але першапачаткова лялькі ўзніклі і існавалі ў непасрэднай сувязі з сакральным.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ